С. А. Сычова (г. Мінск, Беларусь)

# ПСІХАЛАГІЗМ ВОБРАЗАЎ КАЗАК А. С. ПУШКІНА, У. ДУБОЎКІ, С. ШУШКЕВІЧА

Размова пра псіхалагізм традыцыйна вядзецца ў творах класічнай літаратуры, якія прызначаны для дарослага чытання. Само паняцце мае розныя вызначэнні. Звернемся да паняцця «псіхалагізм» як да індывідуалізаванага ўспрымання перажыванняў у іх узаемасувязі і непаўторнасці. У дзіцячай літаратуры «скрыты псіхалагізм», ён выяўлены своеасабліва, скіраваны дапамагчы чытачу зразумець асноўныя праблемы, зрабіць высновы.

Казкі А. С. Пушкіна не былі напісаны спецыяльна для дзяцей, яны з цягам часу перайшлі ў дзіцячы рэпертуар. Гэтыя творы маюць багаты падтэкст, трактуюцца крытыкамі з міфалагічнага падыходу.

У. Дубоўка, С. Шушкевіч напісалі свае казкі спецыяльна для дзяцей. Паміж творамі пісьменнікаў амаль стагоддзе, належаць яны да розных літаратур, аднак іх аб’ядноўвае імкненне данесці асноўныя чалавечыя вартасці.

Так, «Сказка о рыбаке и рыбке» паказвае, што жаданні не павінны быць бязмежнымі. Калі дарослы чытач бачыць сквапную жанчыну, якае прагне дабрабыту, улады, і пры гэтым сама не робіць ніякіх высілкаў. На яе працуе муж-рыбак, якому пашэнціла і які прасіў самае неабходнае. Аднак прагная баба не можа спыніцца, узнікае праблема завышаных патрабаванняў да ўсіх навокал, акрамя сябе. І як вынік: баба застаецца «у разбитого корыта».

Дзеці, прачытаўшы гэты твор, робяць іншыя высновы. Яны шкадуюць дзеда, якога не разумее і крыўдзіць злая баба, ацэньваюць паводзіны жанчыны і прыходзяць да разумення, што калі зашмат хочаш – можаш застацца ні з чым. Варта заўважыць і тое, што жаданні бабы ўзбуйняюцца паступова. У дадзеным выпадку варта засяродзіць увагу на неабходнасць своечасова спыніцца ў сваіх жаданнях:

Ей с поклоном старик отвечает :
«Смилуйся, государыня рыбка!
Что мне делать с проклятою бабой?
Уж не хочет быть она царицей,
Хочет быть владычицей морскою;
Чтобы жить ей в Окияне-море,
Чтобы ты сама ей служила
И была у была у ней на посылках».
Ничего не сказала рыбка,
Лишь хвостом по воде плеснула
И ушла в глубокое море [2, с. 69].

Неабходна звярнуць увагу і на тое, як мяняецца колер мора, з павелічэннем жаданняў бабы: «море слегка разыгралось», «не спокойно синее море», «почернело синее море», «на море черная буря». Такім чынам аўтар паказвае ўнутраны стан рыбкі, яе адносіны да паводзін бабы.

У казцы С. Шушкевіча «Камар-брыкун і Жаба-квактуха» праблема неадпаведнасці ацэнкі ўласнай асобы, прэтэнзій на вызначэнне свайго месца ў грамадстве вырашаецца інакш:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

А вяльможа, пан высокі,
Надзімаў, пузырыў шчокі.
Капялюш ён меў з кукардай
І на ўсіх глядзеў з пагардай [3, с. 148].

Камар прэзентуе сябе як вялікага пана, птушкі чакаюць яго з’яўлення, але Жаба, якая вельмі хацела паглядзець на вялікага пана, выпадкова праглынула і яго, і карэту:

Скача жаба па балоце
З панам камаром у роце [3, с. 150].

Юныя чытачы разумеюць камічнасць абмаляванай сітуацыі, робяць вывады. Гэтая казка больш простая па зместу, менавіта таму, што яна пісалася для невялікіх дзяцей.

У. Дубоўка падыходзіць да асэнсавання значнасці месца чалавека ў свеце з іншага боку. У казцы «Чые рукі прыгажэйшыя» асноўнымі крытэрыямі прыгажосці з’яўляюцца працавітасць, уменне спачуваць, прыйсці на дапамогу. Пісьменнік развіццём падзей падводзіць чытача да высновы, радкамі з твора дапамагае асэнсаваць яго асноўную ідэю:

Яны парэпаны, яны пабіты,
Яны салёным потам перамыты.
Яны мяне, якую лёс знясіліў,
Да новага жыцця ўваскрасілі.
Няма на свеце ім красою роўных,
А прыгажэй за вашы – безумоўна! [1, с. 96]

Тэма працоўнага выхавання займае значнае месца ў фарміраванні асобы маладога чалавека. Уплыў народных сацыяльна-бытавых казак можна прасачыць у «Сказке о попе и его работнике Балде» А. С. Пушкіна. Безумоўна, яна высмейвае служак царквы, узвышае простага чалавека, у ёй перамагае работнік Балда (імя гаворачае). Аўтар падкрэслівае, што кемлівасць, спрыт, розум, уменне працаваць дапамагаюць герою выйсці пераможцам.

У казцы «Айога» У. Дубоўкі не толькі раскрываецца тэма працоўнага выхавання, але і расказваецца пра з’яўленне гускі. Сюжэт твора абапіраецца і на беларускую народную казку пра індыка, пеўня і курачку і на паданне пра з’яўленне кветкі нарцыс. У ёй уздымаецца праблема вонкавай і сапраўднайпрыгажосці.

С. Шушкевіч па-новаму трактаваў рускую народную казку «Рэпка». У народнай казцы пасадзіў дзед рэпку і вырасла яна вялікая-вялікая. Пісьменнік называе твор «Казка-быль пра рэпку», адпаведна і трактоўка гісторыі рэалістычная. Як і ў народнай казцы, вырываць рэпку прыйшлі дзед, бабка, унучка, сабака, кошка, курка, але «ўраджай шукалі да сёмага поту». Такім чынам, аўтар паказвае, што без працы нічога не атрымаеш. Пісьменнік закранае і праблему адказнасці за свае ўчынкі, таму што самі пасадзілі, нікога не пыталі, на полі не бывалі, вынік атрымалі адпаведны намаганням.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Такім чынам, можна сцвярджаць, што ў казках А. С. Пушкіна, У. Дубоўкі, С. Шушкевіча псіхалагічны стан герояў раскрываецца праз іх паводзіны, а сучаснаму чытачу гэтыя творы цікавы тэмамі, якія яны закранаюць.

**Літаратура**


1. Дубоўка, У. Залатыя зярняты / У. Дубоўка. – Мінск : Маст. літ., 1975. – 352 с.
2. Пушкин, А.С. Сказки / А. С. Пушкин. – Минск : Юнацтва, 1984. – 143с.
3. Шушкевіч, С. Птушыны ранак / С. Шушкевіч. – Мінск : Юнацтва, 2001. –159 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ